

Анатолій Маркевіч



Пасяджэнне калегіі

# Новыя напрамкі супрацоўніцтва

**Сумеснае пасяджэнне калегій міністэрстваў культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, адкрыццё Дзён культуры Расіі ў Беларусі... Што яшчэ адбывалася ў Брэсце 2—3 лістапада і чым падзеі адметныя ва ўмацаванні культурных сувязей краін Саюзнай дзяржавы? Храналогія знакавай сустрэчы — у словах і справах яе ўдзельнікаў.**

Праграма мерапрыемстваў распачалася 2 лістапада: у мемарыяльным комплексе "Брэсцкая крэпасць-герой" адбылося ўрачыстае ўскладанне кветак і закладка алеі ліп з удзелам міністраў культуры дзвюх краін — **Анатолія Маркевіча** і **Вольгі Любімавай**. Пазней у Брэсцкім аблвыканкаме прайшло сумеснае пасяджэнне калегій міністэрстваў культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

## ПАМЯЦЬ АБ МІНУЛЫМ

Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы **Дзмітрый Мезенцаў** напярэдадні пасяджэння заявіў, што работа па капітальным рамонце, рэстаўрацыі і музеефікацыі аб'ектаў Брэсцкай крэпасці будзе працягнутая ў наступным годзе, істотныя сродкі на гэта закладзеныя ў праекце саюзнага бюджэту, актывізуецца работа па стварэнні маладзёжнага патрыятычнага цэнтра на Кобрынскім умацаванні.

З улікам павелічэння саюзнага бюджэту на 38 % у наступным годзе плануецца праводзіць больш мерапрыемстваў культурна-гуманітарнай і патрыятычнай скіраванасці: кадэцкіх маладзёжных змен і спартакіяд, прымеркаваных да гадавін буйных бітваў Вялікай Айчыннай вайны. Таксама ў наступным годзе да 3 ліпеня выйдзе новая кніга з серыі Саюзнай дзяржавы, прысвечаная партызанскаму руху. У выданні будуць прадстаўленыя новыя факты злачынстваў нацыстаў на тэрыторыі Беларусі і найбліжэйшых суб'ектаў Расійскай Федэрацыі.

Адна з найважнейшых задач культурна-гуманітарнага ўзаемадзеяння не штучна, а рэальна фарміраваць адзіную культурную прастору Саюзнай дзяржавы, у тым ліку працягваць пошук талентаў, якія ў наступным годзе атрымаюць прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва. Таксама варта падтрымаць заснаванне прэміі маладым талентам, прызначанай для людзей да 35 гадоў. Яшчэ адна з ідэй, якая ўзнікла нядаўна, — вярнуцца да традыцыі правядзення харавых фестываляў.

## ПЕРСПЕКТЫВЫ АГУЛЬНЫХ ПРАЕКТАЎ

Адкрываючы сумеснае пасяджэнне, міністр культуры Беларусі Анатолій Маркевіч паведаміў аб выкананні Плана супрацоўніцтва паміж міністэрствамі культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі на 2022—2024 гады. Ён адзначыў, што асаблівае месца сярод прадугледжаных дакументам культурных падзей займаюць мерапрыемствы Саюзнай дзяржавы. У найбліжэйшы час, пасля некалькіх гадоў перапынку, адбудуцца гастролі Маладзёжнага беларуска-расійскага сімфанічнага аркестра. Выступленні артыстаў могуць быць прадстаўлены на розных міжнародных пляцоўках. Знакавай падзеяй таксама стала правядзенне сёлета Першага беларуска-расійскага музейнага форуму, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі больш як 70 музейных устаноў з 18 рэгіёнаў Расіі, было падпісана больш за 40 пагадненняў паміж музеямі. Як адзначыў міністр, спецыялісты Беларусі і Расіі з'яўляюцца стратэгічнымі партнёрамі ў сумеснай кінавытворчасці, аднак дагэтуль яшчэ не вызначаны яркі сумесны кінапраект, прымеркаваны да знакавай даты нашай агульнай гісторыі — 80-годдзя Вялікай Перамогі. Неабходна аператыўна працягнуць работу ў гэтым напрамку.

Як распавяла міністр культуры Расіі Вольга Любімава, дзякуючы сумеснай рабоце нашых міністэрстваў і ўстаноў культуры рэгіёнаў сумесныя мерапрыемствы ў 2023 годзе праходзяць штомесяц. Сёлета быў перазапушчаны фестываль Саюзнай дзяржавы "Творчасць юных", які прайшоў у Музеі Перамогі ў Маскве. Лічбы гавораць самі за сябе: трансляцыя гала-канцэрта фестывалю сабрала 15 мільёнаў праглядаў, больш было толькі ў "Славянскага базару". Таксама міністр культуры Расійскай Федэрацыі прапанавала стварыць агульны беларуска-расійскі план памятных мерапрыемстваў, прысвечаных дзвюм значным датам — 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-годдзю Вялікай Перамогі.

Гаворачы аб арганізацыі сумесных мастацкіх праектаў, Анатолій Маркевіч адзначыў, што ў Беларусі на іх існуе вялікі запыт сярод аматараў мастацтва, прапанаваўшы пачаць з абменных выстаў, прысвечаных 180-годдзю вялікага рускага жывапісца Ільі Рэпіна, які правёў частку свайго жыцця на Віцебшчыне, дзе стварыў вялікую колькасць шэдэўраў. Трэба таксама ўключыць у праграму праекты, якія папулярызуюць народныя святы і абрады, магчыма, наспела неабходнасць у арганізацыі адпаведнага тэматычнага фестывалю.

## РАЗНАСТАЙНАСЦЬ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Аб перспектыўных напрамках супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы на 2024—2026 гады распавяла намеснік дырэктара Дэпартамента музеяў і знешніх сувязей міністра культуры Расійскай Федэрацыі **Алена Харламава**, адзначыў-




Члены калегіі прынялі ўдзел у закладанні алеі ліп. ▼





Дзяржаўны камерны аркестр джазавай музыкі імя Алега Лундстрэма



Вольга Любімава

шы, між іншага, што ў будучыні плануецца вылучэнне сродкаў на работы ў мемарыяльным комплексе "Трасцянец" і Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры ў Полацку. Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь **Сяргей Саракач** падзяліўся планамі чарговага этапу рэстаўрацыі і музеефікацыі збудаванняў Брэсцкай крэпасці, адзначыўшы, што агулам на гэтыя мэты мяркуецца вылучыць 493 мільёна расійскіх рублёў.

Дырэктар Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра "Новая Расія" **Дзмітрый Грынчанка** і рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі **Алена Куракіна** распавялі аб планах правядзення гастроляў Моладзевага беларуска-расійскага сімфанічнага аркестра, якія адбудуцца неўзабаве і дазволяць маладым музыкантам з абедзвюх краін прадэманстраваць публіцы творчы патэнцыял.

Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **Вадзім Гігін** прадставіў перспектывы стварэння Лічбавай бібліятэкі Саюзнай дзяржавы. Праект, як мяркуецца, будзе ўключаць тры асноўныя крокі. Першы з іх — стварэнне мабільнага дадатку, які аб'яднае залаты фонд літаратур абедзвюх краін. Другі этап — збор калекцыі дакументаў па гісторыі беларуска-расійскай інтэграцыі. Трэцім этапам зробіцца стварэнне фонду дысертацый Саюзнай дзяржавы.

Актывізацыю супрацоўніцтва ў сферы кінематаграфіі абмеркавалі генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" **Юрый Аляксей** і выканаўчы дырэктар Федэральнага фонду сацыяльнай і эканамічнай падтрымкі айчыннай кінематаграфіі **Фёдар Сасноў**. Між іншага, Юрый Аляксей падзяліўся планамі стварэння праекта ў форме дакументальнага кіно пад назвай "Дзве краіны — адзін лёс", які распавядзе аб жыцці беларускай дыяспары ў Расіі і расійскай дыяспары ў Беларусі.

Намеснік генеральнага дырэктара "Росконцерт" **Святлана Кандрацьева** распавяла аб фарміраванні адзінага беларуска-расійскага гастрольнага плана, а начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь **Ірына Дрыга** і рэктар Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных **Аляксандр Рыжынскі** паразважалі аб рэалізацыі фестываляў, абменных гастроляў, сумесных праектаў тэатраў і канцэртных арганізацый дзвюх краін.



Падчас выставы

Аб сумеснай дзейнасці па духоўна-маральным збліжэнні народаў Беларусі і Расіі, недапушчэнні фальсіфікацыі гісторыі і захаванні гістарычнай праўды распавялі дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея **Аляксандр Храмой** і генеральны дырэктар Дзяржаўнага гістарычнага музея **Аляксей Лявыкін**, а генеральны дырэктар "РОСИЗО" **Вольга Галакціёнава** прадставіла планы рэалізацыі сумесных выставачных праектаў, накіраваных на фарміраванне агульнай культурнай прасторы.

## АБМЯНЯЛІСЯ ЎЗНАГАРОДАМІ

Анатолій Маркевіч уручыў грамату Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь калектыву Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі ў асобе Вольгі Любімавай. Таксама граматамі ўзнагароджаныя генеральны дырэктар Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі Вадзім Дуда, дырэктар Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра "Новая Расія" Дзмітрый Грынчанка і рэктар Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных Аляксандр Рыжынскі.

Падзяка міністра культуры Рэспублікі Беларусь абвешчаная намесніку дырэктара Дэпартамента музеяў і знешніх сувязей Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі Антону Кузняцову і начальніку аддзела СНД, ЕАЭС і міжнародных арганізацый Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі Марыі Сергіенка.

У сваю чаргу, падзяку міністра культуры Расійскай Федэрацыі атрымалі дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Варапаеў, генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Кацярына Дулава, начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Ірына Дрыга, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Ірына Карповіч, генеральны дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі Аляксандр Нікіта, начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння са СМІ Міністэрства культуры Вікторыя Ратабыльская і дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр Храмой.

## ПАДАРУНАК АД ГАСЦЕЙ

Увечары ў Брэсцкім абласным акадэмічным тэатры драмы адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця Дзён культуры Расіі ў Беларусі і канцэрт Дзяржаўнага камернага аркестра джазавай музыкі імя Алега Лундстрэма. Вітаючы прысутных, міністр культуры Беларусі Анатолій Маркевіч падкрэсліў, што зусім не выпадкова Дні культуры Расіі ў Беларусі праходзяць менавіта тут, на свяшчэннай брэсцкай зямлі, дзе 82 гады таму нашы бацькі і дзяды далі адпор фашызму. Сёння мы разам супрацьстаім неймавернай эканамічнай, палітычнай і духоўнай экспансіі, якая спрабуе разарваць наш сяброўскі саюз. Але палітыка забарон і пагроз у адрас расійскай і беларускай культур бесперспектыўныя. Нашы культурныя сувязі толькі мацнеюць — на ўзроўні міністэрстваў, рэгіёнаў і мастацкіх калектываў.

Міністр культуры Расіі Вольга Любімава падкрэсліла, што гэта вялікі гонар — сёння прадстаўляць расійскую культуру ў Брэсце, пачаўшы дзень з ушанавання памяці людзей, якія біліся за наш агульны мір, нашу агульную Перамогу, а для нас выпаў вялікі гонар — разам рыхтавацца да 80-годдзя гэтай Перамогі. Вялікая радасць, што мы разам працуем, абмяркоўваем рэпертуар, гастролі нашых артыстаў. І вялізная радасць для двух міністэрстваў заключаецца ў тым, што гэты працэс адбываецца не за кошт даручэнняў, не па неабходнасці. Гэта такая натуральная, агульная культурная прастора і для тых, хто працуе на сцэне, і для тых, хто прыходзіць у глядзельную залу.

Праграма аркестра Алега Лундстрэма была незвычайнай. У джазавай апрацоўцы прагучалі "Кацюша", "Цёмная ноч", песні з фільма "Верныя сябры". Уразіла публіку саксафаністка Соф'я Цюрына — пераможца Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу "Шчаўкунок", уладальніца Гран-пры конкурсу "Сіняя птушка". Нягледзячы на юны ўзрост (Соф'я нарадзілася ў 2007 годзе), у яе актыве больш за 500 канцэртаў, выступленне з Дзяржаўным камерным аркестрам "Віртуозы Масквы" пад кіраўніцтвам Уладзіміра Співакова і з Маскоўскім джазавым аркестрам пад кіраўніцтвам Ігара Бутмана.

Любімыя многімі мелодыі мінулага выканала вядомая джазавая спявачка Анастасія Лютава. У зале брэсцкага тэатра ў яе выкананні прагучалі песні, якія памятаюць і любяць спяваць і ў Беларусі, і ў Расіі: "Вярні мне музыку", "Чорны кот" і іншыя.

А 3 лістапада ўдзельнікі мерапрыемстваў наведалі з экскурсійнай праграмай мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" і археалагічны музей "Бярэсце", паўдзельнічалі ў пасадцы дрэваў, а таксама азнаёміліся з дзейнасцю Моладзевага патрыятычнага цэнтра. Падзеі, што адбыліся ў рамках Дзён культуры Расіі ў Беларусі, яшчэ раз пацвердзілі важнасць аб'яднання высілкаў работнікаў сферы культуры абедзвюх краін для супольнай працы на агульную карысць.

**Антон РУДАК**